УДК 82:398.91

**Б. А. Крук**
**І. А. Паўлюкова**

# ПРЫКАЗКІ І НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ І ІХ РОЛЯ Ў РАЗВІЦЦІ МАЎЛЕННЯ І ДАЛУЧЭННІ ВУЧНЯЎ ДА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

*У артыкуле разглядаюцца розныя метадычныя прыёмы працы з прыказкамі і народнымі прыкметамі на ўроках літаратурнага чытання. Паказана роля прыказак і народных прыкмет у пашырэнні слоўніка вучняў, развіцці звязнага маўлення, маральна-этычным і культуралагічным выхаванні.*

***Ключавыя словы:*** *прыказка, народная прыкмета, маральна-этычнае выхаванне, нацыянальная культура.*

## Уводзіны

Мудрасць і назіральнасць беларусаў, іх маральна-этычныя погляды адбіліся ў разнастайных жанрах фальклору. Вядома, што паняцце “фальклор” ахоплівае розныя праявы жыцця, быту, народнай культуры, а ў перакладзе з англійскай мовы азначае народныя веды, народную мудрасць. Асабліва выразна праяўляецца культура і быт беларуса, яго назіральнасць, імкненне да справядлівасці, яго думкі пра шчасце, дабро і зло ў прыказках і народных прыкметах.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Многія прыказкі ўсхваляюць гаспадарлівасць, сумленнасць, шчырасць, гасціннасць беларуса. У шматлікіх прыказках асуджаюцца заганы чалавека: гультайства, зайздрасць, хлуслівасць і інш. Прыказкі арыентаваны на выхаванне важнейшых якасцей чалавека: патрыятычных пачуццяў, працалюбства, таварыскасці, сяброўства і дружбы, сумленнасці і гонару, іншых маральна-этычных якасцей.

**Асноўная частка**

Прыказкі шырока пададзены ў падручніках па літаратурным чытанні, бо гэта даступны ўспрыманню і разуменню вучнямі жанр, які валодае вялікімі (пры ўмове ўмелага выкарыстання) інфармацыйна-камунікатыўнымі, эстэтычна-мастацкімі і выхаваўчымі магчымасцямі [2; 6; 11; 13]. Так, у падручніку па літаратурным чытанні для 4 класа [3; 4] змешчаны прыказкі аб Радзіме (с. 5, с. 8, с. 90, с. 107), аб кнізе і сіле ведаў (с. 21, с. 31, с. 50), аб мове (с. 52), пра добрыя справы дзяцей (с. 69, с. 103, с. 113) і інш. Усяго ў падручніку змешчана 43 прыказкі: у першай частцы 36, у другой – 7 прыказак. Трэба адзначыць, што шырока пададзены ў гэтай частцы і народныя прыкметы.

У метадычнай літаратуры пытанням выкарыстання прыказак удзелена ўжо дастаткова ўвагі. Настаўнікі-практыкі і вучоныя-метадысты прапануюць выкарыстоўваць прыказкі ў час дыдактычных гульняў [7], разглядаюць іх як дзейсны сродак развіцця маўлення [9; 13], арыентуюць на неабходнасць іх выкарыстання на ўроках і ў пазакласнай працы [5; 1; 11]. Гэта сведчыць аб вялікім патэнцыяле прыказак у навучанні, культуралагічным развіцці і выхаванні маральных пачуццяў і маральнай свядомасці вучняў.

Аналіз змешчаных у падручніках па літаратурным чытанні прыказак паказвае, што ў настаўніка ёсць вялікія магчымасці ў выкарыстанні прыказак на ўроках. Гэты жанр можа выкарыстоўвацца на розных этапах урока літаратурнага чытання і з рознай мэтай (гл. малюнак). Падбор прыказак па тэмах будзе карысны як пры чытанні асобных апавяданняў, вершаў, казак, баек, так і на абагульняльных уроках.



**Малюнак – Фрагмент урока “Карагод”**

МГПУ им. И.П.Шамякина

Так, вучням 4 класа ў час чытання твораў раздзела “Мы ўсе старацца будзем дзеля карысці людзям” можна прапанаваць прыказкі і пытанні да іх, якія прадугледжваюць выбар прыказкі з некалькі прапанаваных. Вучні суадносяць заданні з прыказкамі, якія асуджаюць скупасць:

*1. За грош і ў Маскву збегае.*

*2. За капейку і бацьку роднага прадасць.*

*3. Рад бы госцю – хлеба шкода.*

*4. Ласы на чужыя каўбасы.*

Заданні:

1. Якая прыказка гаворыць аб ненадзейнасці скупога чалавека? (2)

2. Якая прыказка сцвярджае, што скупы чалавек здольны на непрыгожыя і недарэчныя ўчынкі? (1)

3. Якая прыказка сцвярджае, што скупы чалавек не можа быць шчырым і гасцінным? (3)

4. Якая прыказка асуджае скупасць і перадае імкненне скупога чалавека пакарыстацца чужымі рэчамі? (4)

Такая праца пераконвае вучняў, што ўсе прыказкі асуджаюць скупасць, але адрозніваюцца зместам. Безумоўна, адказы вучняў будзе ўдакладняць і пашыраць настаўнік, што дазволіць выхаванцам “дакрануцца да мудрасці народнай” і зразумець розныя з’явы, узбагаціць слоўнікавы запас, свій жыццёвы і маральна-этычны вопыт.

Прапанаваць вучням прыказкі можна ў час чытання і аналізу твораў розных жанраў. Так, у час аналізу апавядання А. Якімовіча “Па дарозе са школы” вучні засвояць яго змест: замест кладкі, якую сарвала вясенняя паводка, хлопчыкі зрабілі новую. Бабуля падзякавала хлопчыкам за гэта. Падкрэсліць змест апавядання і скіраваць чытанне на вырашэнне выхаваўчых задач дапамогуць прыказкі: *1. Ад добрага не ўцякай і ліхога не рабі. 2. Садок пасадзіў, добрую справу зрабіў. 3. Не хвалі сябе, хай людзі пахваляць. 4. Як мы да людзей, так і людзі да нас. 5. Добрая справа сама сябе хваліць.*

Герой апавядання А. Якімовіча “Дапамога” (с. 37–39) Пеця Сіняк дапамагае ветэрану Ігнату Васільевічу. Хлопчык расказаў франтавіку, што ў класе яго называюць “Сіняк-слабак”, бо ён часта хварэе. Ігнат Васільевіч папрасіў хлопчыка дапамагчы яму: “дактары раяць бегаць, але аднаму боязна”. Усю зіму Пеця бегаў з ветэранам. Вясной на школьным стадыёне ў прысутнасці ўсіх вучняў класа ён абагнаў Ваню, які насмешліва называў Пецю слабаком. Падкрэсліць ідэйны змест, растлумачыць назву апавядання “Дапамога” дазволяць прыказкі: *1. Кожны пачатак цяжкі. 2. Языком малоць – не дровы калоць. 3. За справу бярэшся – не бойся і не хваліся.*

Няма ў падручніку прыказкі да байкі Ул. Корбана “Алёша і Лявон”. Алёша ўмее плаваць, а Лявон хоча навучыцца плаваць, але баіцца “лезці ў ваду”. Мы прапануем у час працы з тэкстам выкарыстаць да байкі наступныя прыказкі: *1. Баязліўцу і заяц – воўк. 2. У страха вочы вялікія. 3. Баязліваму і капа стогам здаецца. 4. Хто баіцца, таму ў вачах дваіцца. 5. Адважны не баіцца няўдачы.*

МГПУ им. И.П. Шамякина

Герой апавядання Я. Маўра “На крызе” Мікітка пераадолеў хваляванне і свій страх, калі забыўся пра яго. Падкрэсліць змест апавядання дапамогуць прыказкі: *1. Вочы страшацца, а рукі робяць. 2. У страха вочы вялікія. 3. Напалоханая варона і вераб’я баіцца. 4. Стуліў хвост, ды пад мост.*

Вучні адкажуць на пытанні: Як звычайна гавораць пра баязлівага чалавека? Якая з прыказак больш падыходзіць да зместу апавядання?

Да раздзела “Дзе карані твае, адкуль твой род пачаўся…” мы прапануем выкарыстаць прыказкі: *1. Хто мову і веру мяняў, той не толькі сябе, а маці прадаваў. 2. Хто роднага краю цураецца, той і маткі сваёй адцураецца.*

У час працы з апавяданнем “Падкідышы” В. Гурскага мэтазгодна выкарыстаць прыказкі аб дружбе: *1. Сябрамі не кідаюцца. 2. Птушка моцная крыламі, а чалавек дружбай. 3. Ненадзейны друг страшней ядавітага ворага. 4. Той не можа быць другам, хто ў бядзе абыдзе кругам. 5. Моцны статак чарадою, а людзі грамадою. 6. Новых сяброў набывай, але і старых не забывай.*

Выхаванню таварыскасці, сяброўства, дружбы, пашырэнню слоўніка, развіццю звязнага маўлення будзе спрыяць праца ў падрыхтоўцы вучнямі кароткіх выказванняў па наступных прыказках: *1. Адным пальцам і гузік цяжка зашпіліць. 2. Адна пчала мёду не наносіць. 3. Сябрамі не кідаюцца.*

Такім чынам, прыказкі дапамагаюць данесці да вучняў галоўную думку твора, асэнсаваць яе глыбей, даць правільную ацэнку ўчынкам герояў твора, арыентуючыся на зафіксаваную ў прыказцы народную мудрасць.

Вучэбная праграма па літаратурным чытанні акцэнтуе ўвагу настаўніка на неабходнасць удасканалення наступных чытацкіх уменняў:

а) узнаўляць мастацкія вобразы паводле прачытанага;

б) асэнсоўваць значэнне і ролю твораў фальклору і адрозніваць фальклорныя жанры.

Выпрацоўцы названых уменняў будзе спрыяць праца з народнымі прыкметамі, якія даволі шырока пададзены ў падручніках па літаратурным чытанні, асабліва ў раздзелах на сезонныя тэмы. Адразу адзначым, што аднастайнага падыходу да вызначэння гэтага жанру няма. Так, у энцыклапедыі “Беларускі фальклор” прыкмета падаецца як “жанравая разнавіднасць малой фальклорнай прозы, пад якой разумееца прадказанне пэўнага выніку, пацверджанага многавяковым народным вопытам” [1, с. 389].

Так, у падручніку па літаратурным чытанні для 4 класа 5 народных прыкмет змешчаны ў раздзеле “Кажуць, у дарозе восень залатая…” (с. 84), 1 народная прыкмета пададзена ў раздзеле “Мяккі снег лятае пухам, і канца яму няма…” (с. 49), 7 народных прыкмет змешчаны ў раздзеле “Вясна прыйшла, каб святам стаць” (с. 93). Аўтары падручніка не прапануюць народных прыкмет толькі ў раздзеле “Слава травам, слава кветкам, слава летнім яркім дням…”. Настаўнік можа падрыхтаваць 2–3 прыкметы да ўрока і прапанаваць вучням растлумачыць прыкметы, якія прадказваюць надвор’е (напрыклад, да апавядання Міколы Корзуна “Міколкаў барометр”): *1. Падняўся вецер – будзе дождж. 2. Лес зімой шуміць – чакай адлігі.*

МГПУ им. И.П.Шамякина

Пры вывучэнні апавядання В. Гурскага “Развітальная песня” вучні будуць знаходзіць і тлумачыць народныя прыкметы, арыентуючыся на пытанні настаўніка: 1. Якой будзе восень, калі жураўлі позна ляцяць у вырай? (*Жураўлі позна ляцяць у вырай – восень будзе цёплая і працяглая.*) 2. Аб чым папярэджвае людзей адлёт у вырай гусей? (*Гусі адлятаюць у вырай – хутка прыйдзе зіма.*) 3. Якой будзе восень, калі шпакі доўга не адлятаюць ў вырай? (*Шпакі доўга не адлятаюць – восень будзе працяглая.*) 4. Калі жураўлі ляцяць у вырай высока і марудна – пра што гэта сведчыць? (*Жураўлі ляцяць высока і няспешна, часта курлыкаючы, – восень будзе звонкая, чыстая.*)

Зрокавае ўспрыманне народных прыкмет у час чытання і пошук адказаў на пастаўленае настаўнікам пытанне будзе развіваць навык беглага чытання, якое непасрэдна ўплывае і развівае свядомасць чытання. Абагульняючы адказы вучняў, настаўнік адзначыць назіральнасць як вызначальную рысу беларусаў і прапануе растлумачыць наступныя народныя прыкметы: *1. Качак не выгнаць з вады – будзе дождж. 2. Мошкі сляпіцаю лезуць у вочы – будзе дождж.*

У 4 класе вучням можна прапанаваць самастойна сфармуляваць прымету па пачатку: *1. Сонца вечарам заходзіць у хмары* – (на дождж). *2. Апала вішня* – (хутка прыйдуць халады) (як і прыказка: *Вішня не апала – зіма не настала*). *3. Шмат жалудоў на дубах* – (на цёплую зіму). *4. Вялікія мурашнікі ўвосень* – (на суровую зіму). Не меншую цікавасць у вучняў, як паказвае практыка, выклікаюць заданні ў афармленні народных прыкмет па прапанаваных дзвюх частках. Напрыклад:

| | |
|---|---|
| *1. Купаюцца ў пяску вераб’і –* | *чакай халадоў (2).* |
| *2. Пчолы ў красавіку не вылецелі –* | *на дождж (1).* |
| *3. Снег наліпае на дрэвы –* | *на мароз (4).* |
| *4. Кот скрабе кіпцюрамі дрэва –* | *будзе цёпла (3).* |

У час чытання і аналізу казкі А. Ахмедавай “Зіма-падманшчыца” (с. 47–49) будзе выкарыстана прыкмета, змешчаная ў падручніку (*Калі зіма снежная, лета будзе дажджлівае*). Але наступны раздзел чытання – “Вясна прыйшла, каб святам стаць”. Таму мэтазгодна прапанаваць вучням (на абагульняльным або на ўводным уроку да раздзела) цікавыя народныя прыкметы аб вясне. Вучні будуць не проста тлумачыць гэтыя прыкметы, а знаходзіць адказы на пытанні: 1. Аб чым сведчыць ранні вылет пчол з вулляў? (*Ранні вылет пчол – ранняя і цёплая вясна.*) 2. Аб чым сведчыць пажоўклая лістота вяршалін бяроз? 3. Калі лістота пачынае жаўцець знізу – аб чым гэта сведчыць? (*Увосень лістота на бярозах пачынае жаўцець з вяршалін – вясна ранняя, знізу – позняя.*)

Працуючы з народнымі прыкметамі, змешчанымі ў падручніку на с. 93, настаўнік прапануе пытанні, якія прадугледжваюць тэматычную групоўку прыкмет: 1. Якія прыкметы сведчаць аб тым, што вясна будзе ранняя? (*Калі восенню снег выпадае, вясна будзе ранняя. Раннія халады ў лістападзе – да ранняй вясны.*) 2. Якія прыкметы сведчаць, што вясна прыйдзе позна? (*Туман*

МГПУ им. И.П.Шамякина

*у лістападзе – позняя вясна. Увосень лістота на бярозах пачынае жаўцець знізу – вясна позняя.*)

Так вучні заўважаюць, што аб зменах у прыродзе можна здагадацца не па адной, а па некалькіх фактах-прыкметах, што сведчыць аб клапатлівасці беларусаў, аб іх уважлівасці і назіральнасці да прыроды, што спрыяла ім весці паспяхова гаспадарку.

Працуючы з двухкампанентнымі прыкметамі, вучням можна прапанаваць заданне закончыць прыкмету. Падрыхтаваным вучням 4 класа патрэбна даваць заданні ў самастойным падборы народных прыкмет. Напрыклад: 1. Якія народныя прыкметы ўказваюць на тое, што хутка будзе дождж? (*1. Ластаўкі пырхаюць над вадою – будзе дождж. 2. Сонца вечарам садзіцца ў хмары – будзе дождж. 3. Мурашы хаваюцца ў мурашнік – чакай дажджу.*) 2. Якія народныя прыкметы пацвярджаюць, што год будзе ўрадлівы? (*Бусел прыляціць да Благавешчання – год будзе ўрадлівы.*)

**Заключэнне**

Змест літаратурнай адукацыі ў пачатковай школе рэалізуецца праз асобасна арыентаваны і культуралагічны падыходы. У гэтым плане важная роля адводзіцца выкарыстанню і вывучэнню твораў вуснай народнай творчасці, якія дазваляюць паказаць, падкрэсліць адметнае у побыце, паводзінах, характары беларусаў, далучыць малодшых школьнікаў да нацыянальных каштоўнасцей.

Вопыт, мудрасць, маральна-этычныя погляды беларускага народа яскрава праяўляюцца ў прыказках і прыкметах. Іх выкарыстанне ў сістэме ўрокаў літаратурнага чытання будзе садзейнічаць узбагачэнню слоўніка вучняў, развіццю маўлення і дазволіць паказаць вучням:

а) назіральнасць і гаспадарлівасць беларусаў, іх вялікі жыццёвы вопыт;

б) у прыказках і прыкметах праяўляецца працавітасць, адказнасць беларусаў, іх імкненне жыць заможна, багата;

в) прыказкі і прыкметы – гэта спецыфічная інфармацыя, кіруючыся якой беларус наладжваў свій побыт, працаваў на гаспадарцы, засцерагаў яе ад прыродных стыхій;

г) мастацкая і сэнсавая дасканаласць прыказак і народных прыкмет сведчыць аб прыродных творчых задатках беларусаў, якія і сёння для прадстаўнікоў старэйшага пакалення маюць “пазнавальна-прадказальнае” значэнне.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : ў 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 2006. – Т. 2 : Лабараторыя традыцыйнага мастацтва – “Яшчур”. – 832 с.

2. Вадзінскі, Д. І. Этыка-педагагічныя асновы маральнага фарміравання асобы : дапаможнік для аспірантаў / Д. І. Вадзінскі. – Мінск : МДПІ імя А. М. Горкага, 1992. – 136 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина

3. Вольскі, А. В. Літаратурнае чытанне: падручнік для 4 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / А. В. Вольскі, І. А. Гімпель. – Ч. 1. – Мінск : НІА, 2013. – 136 с.

4. Вольскі, А. В. Літаратурнае чытанне: падручнік для 4 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / А. В. Вольскі, І. А. Гімпель. – Ч. 2. – Мінск : НІА, 2013. – 136 с.

5. Кабинетская, Т. И. Материалы для внеклассной работы с пословицами и поговорками / Т. И. Кабинетская // Начальная школа. – 2000. – № 12. – С. 56–57.

6. Канцавая, Г. М. Сказаў як звязаў: Свята фразеалагізмаў, прыказак, прымавак / Г. М. Канцавая // Пачатковая школа. – 2007. – № 2. – С. 50–52.

7. Латышава, Н. С. Гульні з прыказкамі і прымаўкамі / Н. С. Латышава // Пачатковая школа. – 2001. – № 11. – С. 25.

8. Рахманько, С. А. Использование пословиц на уроках русского языка для формирования орфографической зоркости / С. А. Рахманько // Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа. – 2014. – № 12. – С. 16–20.

9. Солахаў, А. В. Падарожжа ад А да Я : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А. В. Солахаў. – Мінск : Зорны верасок, 2012. – 263 с.

10. Толоконникова, Д. Ю. Использование пословиц и поговорок на уроках русского языка и литературного чтения / Д. Ю. Толоконникова // Начальная школа. – 2009. – № 4. – С. 39–45.

11. Черногрудова, Е. П. Возможности использования русских народных пословиц на уроках / Е. П. Черногрудова // Начальная школа. – 2009. – № 1. – С. 29–32.

12. Янголь, А. У. Мудрыя дарадцы: Прыказкі і прымаўкі / уклад. А. У. Янголь. – Мінск : Юнацтва, 1983. – 94 с.

13. Ярмольчык, Л. В. Добраму вучымся змалку. Развіццё маўлення на ўроках праз выкарыстанне прыказак і прымавак / Л. В. Ярмольчык // Пачатковая школа. – 2015. – № 8. – С. 20–23.

**B. A. Kruk, I. A. Paulyukova**

## STUDYING THE PROVERBS AND FOLK OMENS AT THE LESSONS OF CLASSIC LITERATURE AND THEIR ROLE IN THE CULTURAL EDUCATION OF SCHOOLCHILDREN

**Keywords:** proverb, aesthetic education, national self-awareness.

**Summary**

The article is a study of various methods of using proverbs and folk omens at the lessons of classic literature in primary schools. The role of proverbs and folk omens in the enrichment of schoolchildren’s vocabulary, the development of their moral and aesthetic qualities are also revealed.

МГПУ им. И.П.Шамякина